# ЧЫРВОНКА

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

3 ЛІСТАПАДА 2016 г.

ЧАЦВЕР

№ 20 (15804)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


*Імёны*

## Гурт AILLION: «Мы не «дыназаўры»

**Здаецца, час шырокага захаплення моладзі класічным рокам і металам мінуў. Даўно забытыя, у шафах вісяць скураныя курткі-«касухі», некалі доўгавалосыя хлопцы носяць кароткія стрыжкі, а чорная майка з выявай любімага гурта перастала быць абавязковым атрыбутам металіста. Таму музыку мінскага гурта Aillion можна лічыць пэўнага кшталту анахранізмам: яны ўсё яшчэ граюць стары добры heavy-metal. І, дарэчы, з'яўляюцца досыць паспяховай камандай. Пра тое, чым жыве гурт сёння, якая публіка прыходзіць на канцэрты хлопцаў і чаму сцэнічныя куміры цяпер ператвараюцца ў настаўнікаў, мы гутарым з вакалістам Aillion Канстанцінам ДУДАРАВЫМ і гітарыстам Дзмітрыем МІКУЛІЧАМ.**

***— Сёння многія музыканты іграюць у модных стылях пост-року, пост-металу. А вы — традыцыйны, амаль класічны heavy-metal. Чаму так?***

**Канстанцін:** — Хто яго ведае. Яшчэ ў часы «Стаі» (гурт, які і стаў «адпраўной кропкай» для Aillion. — **Аўт.**) мы сябе пазіцыянавалі як heavy-metal каманда, але тады гэта была, хутчэй, «фішка». Цяпер проста граем музыку, якая ў нас атрымліваецца. Магчыма, яна па стылі сапраўды больш нагадвае класічны heavy-metal, але мне падаецца, што нельга толькі так ахарактарызаваць нашу музыку.

**Дзмітрый:** — Я думаю, што можна. Хоць у нас многа эксперыментаў у музыцы — аранжыроўках, інструментоўцы, кампазітарстве, але нам падабаецца менавіта чысты моцны вакал, што з'яўляецца класікай жанру heavy-metal.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***



*Пазнаёміцца з прафесіяй*

## Кветкі ад Гошы,

### ці Кемлівы конь — знаходка для цырка

**Калі артыстка Белдзяржцырка Вольга ДЗЯГІЛЕВА апранае каўбойскі ўбор і выходзіць на манеж, яе гадаванцы таксама ператвараюцца ў сапраўдных коней з вестэрна. А яны на Дзікім Захадзе ўмеюць усё: могуць ветліва кланяцца гасцям, а ў час небяспекі прыкідвацца мёртвымі. Могуць танцаваць, а могуць сядзець, падабраўшы заднія ногі. Калі ж гаспадыні сумна, разумная істота адшукае букецік кветак і аддасць яго ў рукі. І ўсё гэта без ніякага прымусу...**



Выступленні на сцэне пачаліся для мінчанкі Вольгі ў чатыры з паловай гады. Бацькі напачатку аддалі дзяўчынку ў харэграфічную студыю, а ў шэсць гадоў яна трапіла ў дзіцячы ансамбль «Равеснік». На той час калектыў прадстаўляў Беларусь ледзь не на кожным творчым конкурсе, два разы на год былі абавязковыя выезды ў Маскву, выступленні ў дзіцячым лагеры «Артэк». І калі ў адзінаццаць Вольга вырашыла кінуць танцы, бацькі паставіліся да гэтага адмоўна, тым больш што дачка сама, без дазволу, запісалася ў коннаспартыўную школу.

— Конным спортам займалася сем гадоў, а потым без асаблівых ваганняў з'ехала ў вёску працаваць у калгасе на племяннай ферме. У 1990-х гадах у коннаспартыўных школах было цяжка з фінансамі, не хапала коней. Калгасы ж якраз пачалі багацець, і лічылася прэстыжным прыбудаваць да асноўных фермаў спартыўную стайню. Туды пацягнуліся майстры спорту, сыходзілі нават прафесіяналы міжнароднага класа. Я тады паўгода як скончыла школу, мне прапанавалі — я і паехала. Знаёмым у Мінску такі ўчынак, напэўна, падаўся вар'яцкім, — успамінае Вольга.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

*Не ўпусціць галоўнае*

## ВЫХАВАННЕ НОН-СТОП

### ЧАМУ КОЛЬКАСЦЬ НЕ ЗАЎСЁДЫ ПЕРАХОДЗІЦЬ У ЯКАСЦЬ?

**Як можна вымераць эфект ад ідэалагічнай работы і ў якіх адзінках гэта рабіць? Рублі, сантыметры, грамы, кілаграмы ў дадзеным выпадку не падыходзяць. А можа, па колькасці выхаваўчых мерапрыемстваў, што праводзяцца ва ўстановах адукацыі? Па адсутнасці правапарушэнняў сярод школьнікаў і студэнтаў ці па колькасці маладых людзей, уцягнутых у дзейнасць грамадскіх маладзёжных арганізацый? Як увогуле можна ацаніць працу педработнікаў, якія нясуць адказнасць за ідэалагічнае выхаванне падрастаючага пакалення? Гэта толькі адно са шматлікіх пытанняў, што ўздымаліся ў ходзе калегіі Міністэрства адукацыі. Мерапрыемства было прысвечана ўдасканаленню ідэалагічнай работы ва ўстановах адукацыі: ад школы — да ВНУ.**

**Да таго ж эфект ад ідэалагічна-выхаваўчай работы можа быць як хуткім, так і доўгатэрміновым. Як трапна заўважыла начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля ПШАНІЧНАЯ, «мы БелАЗы не выпускаем, а выхоўваем людзей, якія потым будуць рабіць БелАЗы».**

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

